# Гульня “Зорны дождж”: вывучаем прыслоўе

## Падагульняючы ўрок па тэме “Прыслоўе” ў 7 класе

***М. М. Шчакатовіч,***
***настаўнік беларускай мовы і літаратуры***
***вышэйшай катэгорыі***
***СШ № 16 г. Пінска***

Урок займае перадапошняе месца ў сістэме ўрокаў па тэме “Прыслоўе”. Ён прадугледжвае якасную падрыхтоўку да апошняга ўрока, у час якога будуць праверany веды вучняў па названым раздзеле. Гэта заліковая работа з выкарыстаннем рознаўзроўневых заданняў.

На дадзеным уроку выкарыстоўваецца асобасна арыентаваны падыход, які дазваляе настаўніку замацаваць веды вучняў, высветліць, на што навучэнцам патрэбна яшчэ раз звярнуць увагу, каб на належным узроўні падрыхтавацца да заліковай работы.

**Тэма.** Падагульняючы ўрок па тэме “Прыслоўе”.

**Мэта:** сістэматызаваць і замацаваць раней набытыя веды пра прыслоўе.

**Задачы:**

- ✓ замацаваць уменне правільна пісаць прыслоўі, размяжоўваць іх разрады і ўтвараць, дзе магчыма, ступені параўнання;
- ✓ удасканальваць уменні рабіць марфалагічны і сінтаксічны разборы, пераклад з рускай мовы на беларускую;
- ✓ развіваць лагічнае мысленне, маўленчую культуру школьнікаў;
- ✓ вучыць працаваць у калектыве, індывідуальна, у парах;
- ✓ абуджаць імкненне рабіць дабро, выхоўваць пачуццё прыгожага, цудоўнага, паважлівае стаўленне да роднага слова.

**Тып урока:** урок-спаборніцтва (на аснове гульні “Зорны дождж”).

**Абсталяванне:** малюнкі вучняў, плакаты з дэвізамі, фотаздымкі, карткі-заданні, рабочыя сшыткі.

**Журы:** група настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, якая дапамагае правяраць і ацэньваць заданні.

**Умовы спаборніцтва:** за кожны правільны адказ, за кожнае правільна выкананае заданне даецца зорачка. Каманда-пераможца ўзнагароджваецца прызам і высокімі адзнакамі.

## ХОД УРОКА

### I. Арганізацыйны момант.

Пачатак урока скіраваны на актывізацыю ўвагі вучняў і ўцягванне іх у вучэбную дзейнасць. Настаўнік разам з вучнямі высвятляюць мэту і задачы ўрока.

### II. Паўтарэнне і замацаванне вывучанага.

#### Першы тур

Прадстаўленне каманд. Прэзентацыя кожнай каманды ў выглядзе фотаздымкаў, малюнкаў, вершаваных твораў.

#### Другі тур

Франтальнае апытванне (за кожны правільны адказ даецца зорачка, каманды адказваюць на пытанні па чарзе).

1. Якая часціна мовы называецца прыслоўем? Прывядзіце прыклады.
2. Якім членам сказа можа быць прыслоўе?
3. На якія разрады падзяляюцца прыслоўі?
4. Якія прыслоўі ўтвараюць ступені параўнання?
5. Калі *не* з прыслоўямі пішацца асобна? Прывядзіце прыклады.
6. Калі *не (ня)* з прыслоўямі пішацца разам? Прывядзіце прыклады.
7. Якія прыслоўі пішуцца праз дэфіс? Прывядзіце прыклады.
8. Што могуць абазначаць прэдыкатыўныя прыслоўі?
9. Якімі спосабамі могуць утварацца прыслоўі?

#### Трэці тур

*Раздзяліце дадзеныя прыслоўі на групы па разрадах.*

Блізка, доўга, хутка, навокал, наўмысна, далёка, увесну, часта, згарача, асцярожна, прыблізна, многа, спрасоння, увечары, тут, сумыслу.

***Адказы:***

а) месца дзеяння: блізка, навокал, далёка, тут;
б) час дзеяння: даўно, увесну, увечары;
в) мэта дзеяння: назло, наўмысна, сумыслу;
г) прычына дзеяння: згарача, спрасоння;
д) спосаб дзеяння: хутка, часта, асцярожна;
е) мера і ступень дзеяння: прыблізна, многа.

## Чацвёрты тур

*Ад дадзеных слоў утварыце прыслоўі. Да гэтых прыслоўяў запішыце ўсе магчымыя формы ступеняў параўнання.*

Прыгожы, ціхі, светлы, высокі, спрадвеку.

***Адказы:***

✓ прыгожа – прыгажэй, больш прыгожы, найпрыгажэй, вельмі прыгожа;
✓ ціха – цішэй, больш ціха, найцішэй, вельмі ціха;
✓ светла – святлей, больш светла, найсвятлей, вельмі светла;
✓ высока – вышэй, больш высока, найвышэй, вельмі высока;
✓ спрадвеку – не ўтвараюцца формы ступеняў параўнання.

## Пяты тур

Сінтаксічны разбор сказа і марфалагічны разбор прыслоўяў (конкурс капітанаў).

*Паправіўшы аўтамат за плячом, Васіль нявесела пацягнуўся ў бок узвода.*

*Нявесела* – прыслоўе, абазначае прымету дзеяння; нязм., прыслоўе спосабу дзеяння; акалічнасць.

## Шосты тур

*Перакласці тэкст на беларускую мову і падкрэсліць прыслоўі (выконваюць асобна па два вучні ад каманды).*

Долго стою на опушке рядом с елью, трогаю её блестящие ветки, слегка влажные от ночного тумана. Дышу холодным запахом утра. Сухо, тепло. На светло-голубом сентябрьском небе ни облачка. Смотрю, как оно просыпается.

В лесу полумрак и покой. Листья кустов запотели. Трава покрыта инеем. Серебрится паутина. Не желая рушить волшебное творение, обхожу его стороной.

Наконец выбираюсь на опушку. Там я слушаю птиц, смотрю, как живёт лес. Жаль, что скоро под студёными ветрами потухнут костры берёз, угаснет игра тёплых тонов.

***Руска-беларускі слоўнік для даведак:*** рушить – разбураць, творение – тварэнне, наконец – нарэшце, студёный – сцюдзёны, угаснет – згасне, тонов – таноў, блестящие – зіхатлівыя, слегка влажные – злёгку вільготныя.

***Пераклад на беларускую мову.***

Доўга стаю на ўзлеску побач з ялінаю, чапаю яе зіхатлівыя галінкі, злёгку вільготныя ад начнога туману. Дыхаю халодным пахам раніцы. Суха, цёпла. На светла-блакітным вераснёўскім небе ні воблачка. Гляжу, як яно прачынаецца.

У лесе паўзмрок і спакой. Лісце кустоў запацела. Трава пакрыта інеем. Серабрыцца павуціна. Не жадаючы разбураць чароўнае тварэнне, абыходжу яго бокам.

Нарэшце выбіраюся на ўзлесак. Там я слухаю птушак, гляджу, як жыве лес. Шкада, што хутка пад сцюдзёнымі вятрамі патухнуць кастры бяроз, згасне гульня цёплых таноў.

## Сёмы тур

*Ад дадзеных слоў утварыце прыслоўі, якія пішуцца праз злучок.*

Вяна, першы, наш, воўк, дзе, беларус, дзіця, свой, сусед, ціха, вёска, калі.

***Адказы:*** па-веснавому, па-першае, па-нашаму, па-воўчы, дзе-небудзь, па-беларуску, па-дзіцячы, па-свойску, па-суседску, па-вясковаму, калі-небудзь.

## Восьмы тур

*Раскрыйце дужкі:*

(Не)далёка; (не)пахісна; (не)весела, а сумна; было (не)блізка; дзе(сьці); (абы)як; дзе(нідзе); далёка(далёка); (абы)якава; (не)цяжка; (не)ўважліва; калі(сьці); (не)лёгка; (абы)дзе; (па)ранейшаму; (па)трэцяе; (з)разбегу; (без)аглядкі; (па)ціху.

***Адказы:*** недалёка; непахісна; не весела, а сумна; было не блізка; дзесьці; абы-як; дзе-нідзе; далёка-далёка; абыякава; няцяжка; няўважліва; калісьці; нялёгка; абы-дзе; па-ранейшаму; па-трэцяе; з разбегу; без аглядкі; пацiху.

## Дзявяты тур

*Напішыце словы разам, асобна, праз дэфіс.*

Абы(куды), (з)далёк, воляй(няволяй), (да)зарэзу, (без)канца, (на)памяць, сям(там), (па)брацку, (па)душы, (па)чацвёртае, (па)твойму, (на)віду, урэшце(такі), (як)раз, у рэшце(рэшт), (у)імгненне, (па)зімоваму, па(дзявочы), (у)абрэз, (усё) роўна, (без)(дай)прычыны, (не)(да)твару, (на)бягу, (да)бяла, (па)роўну, (па)мойму, (з)усім, (з)усім класам.

***Адказы:*** абы-куды, здалёк, воляй-няволяй, да зарэзу, без канца, на памяць, сям-там, па-брацку, па душы, па-чацвёртае, па-твойму, на віду, урэшце-такі, якраз, у рэшце рэшт, у імгненне, па-зімоваму, па-дзявочы, у абрэз, усё роўна, без дай прычыны, не да твару, на бягу, дабяла, пароўну, па-мойму, зусім, з усім класам.

## Дзясяты тур

*Размяжуйце дадзеныя прыслоўі па спосабе ўтварэння:*

а) прыставачны; б) суфіксальны; в) прыставачна-суфіксальны.

Па-новаму, тройчы, памалу, няблізка, увосень, убакі, даўно, наглуха, глуха, па-асенняму, па-пятае, весела, пацíху, нідзе, назаўжды, удвая, назаўсёды, добра, спакойна, блізка, па-нашаму.

***Адказы:***

а) увосень, нідзе, назаўжды, назаўсёды;

б) тройчы, даўно, глуха, весела, добра, спакойна, блізка;

в) па-новаму, памалу, убакі, наглуха, па-пятае, па-асенняму, пацíху, удвая, па-нашаму, няблізка, нявесела.

**III. Рэфлексія. Падвядзенне вынікаў гульні.**

**IV. Дамашняе заданне.**

Скласці па два сказы такім чынам, каб прыслоўі выконвалі сінтаксічную ролю акалічнасці, азначэння і выказніка.